# З павагай да духоўнага багацця нашых продкаў

**В. С. Новак,**
загадчык кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі,
доктар філалагічных навук, прафесар,
**А. А. Кастрыца,**
дацэнт кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

*Беларускі фальклор на фоне еўрапейскіх культур вылучаецца ўстойлівай захаванасцю архаічных абрадаў і песень, таму невыпадкова ЮНЕСКА надае асаблівую ўвагу з'явам традыцыйнай культуры розных рэгіёнаў Беларусі.*

На працягу многіх гадоў калектыў выкладчыкаў кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны займаецца вывучэннем народнай духоўнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны, паколькі традыцыйная культура беларусаў з'яўляецца надзейным гарантам захавання ідэнтычнасці і самабытнасці народа ва ўмовах глабалізацыі.

Дзейнасць кафедры звязана з даследаваннем традыцыйнай духоўнай спадчыны беларусаў, якая з'яўляецца выдатнай крыніцай народнай мудрасці і трывалым падмуркам для выхавання патрыятызму, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да культуры свайго народа і павагі да носьбітаў духоўнага багацця нашых продкаў.

Ва ўніверсітэце склалася традыцыя рэгіянальна-лакальнага вывучэння і выдання лепшых узораў вуснай народнай творчасці, даследавання духоўнай культуры асобных раёнаў Гомельскай вобласці і іншых рэгіёнаў Беларусі. У выніку правядзення шматлікіх палявых экспедыцый былі сабраны ўнікальныя фальклорна-этнаграфічныя і міфалагічныя матэрыялы, апублікаваныя ў выданнях «Крыніц кармянскіх перазвоны» (2000), «Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна» (2002), «Вечнае. Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна» (2003), «Спрадвечнай мудрасці скарбонка: сучасны стан традыцыйнай культуры г. Мазыра» (2005), «Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна» (2007), «Лоеўшчына… Бэзавы рай, песенны край. Сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны» (2007), «Народная духоўная культура Брагіншчыны» (2007), «Жаўруковая песня Радзімы. Народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю» (2008), «Зямля чароўная дабра. Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць» (2008), «Святло каштоўнасцей духоўных. Жлобінскі край: мінулае і сучаснае» (2009), «Чачэршчына, нам дадзеная лёсам… Мінулае і сучаснасць Чачэрскага краю» (2010), «Хойнікшчыны спеўная душа. Народная духоўная культура Хойніцкага краю» (2010), «Міфалагічныя ўяўленні беларусаў» (2010), «Вясельная традыцыя Гомельшчыны» (2011), «Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці)» (2013), «Гаючае слова роднай зямлі (беларускія лекавыя замовы)» (2013), «Нясвіжскага краю напеў векавы» (2012), «Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы. Народная духоўная культура Лагойшчыны» (2013), «Жыццё і побыт беларусаў у прыкметах і павер'ях» (2014), «Сусвет і прыродныя стыхіі ў міфалагічнай традыцыі беларусаў» (2014), «Ніжэйшая міфалогія беларусаў у сучасных запісах» (2014), «Жыцця палескага бяздонныя глыбіні. Народная духоўная культура Петрыкаўскага раёна» (2014), «Глыбоччыны духоўнасці глыбіні. Народная духоўная культура Глыбоцкага раёна» (2014).

Матэрыял, змешчаны ў вышэйназваных выданнях, сведчыць пра багацце рэгіянальна-лакальных асаблівасцей фальклорных традыцый Гомельскай вобласці і іншых рэгіёнаў Беларусі. Гэтыя кнігі з'яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй жыцця, побыту і светапогляду нашых продкаў, важнай крыніцай фарміравання ўяўленняў сучаснікаў пра мясцовую спецыфіку традыцыйнага земляробчага календара, сямейных абрадаў і звычаяў, прыкмет і павер'яў. Гэта важна не толькі для захавання духоўнай спадчыны нашых продкаў, але і для прыцягнення ўвагі турыстаў да традыцыйнай культуры, якая складае інтэлектуальны і духоўны этнічны рэсурс. Вядома, што папулярызацыя нацыянальнай культуры з'яўляецца адным з важнейшых прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Як адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, «менавіта нацыянальная культура – стратэгічны рэсурс краіны, краевугольны камень нашай незалежнасці, без якога не можа быць суверэннай і квітнеючай дзяржавы».

Многія задачы па зборы, захаванні і даследаванні фальклорна-этнаграфічнай спадчыны вырашаюцца падчас вучэбнай фальклорнай практыкі, якая з'яўляецца важнай формай самастойнай работы студэнтаў на філалагічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. Яна праводзіцца пас-

ля таго, як студэнты авалодалі тэарэтычнымі ведамі па дысцыплінах «Фалькларыстыка» і «Славянская міфалогія».

Веды па зборы і фіксацыі фальклорна-краязнаўчых матэрыялаў, вывучэнні фальклорных традыцый у палявых умовах, па методыцы запісу, сістэматызацыі і камеральнай апрацоўцы звестак студэнты атрымліваюць непасрэдна падчас выканання індывідуальнай работы пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў па той ці іншай тэме. На лекцыйных і практычных занятках яны знаёмяцца з разнастайнымі метадамі і прыёмамі работы ў палявых умовах (апытванне, анкетаванне, назіранне, фіксацыя матэрыялаў пры дапамозе сучасных тэхнічных сродкаў і інш.). Не заўсёды студэнты могуць абапірацца на ўзоры ілюстрацыйных матэрыялаў, прадстаўленыя ў практычных дапаможніках, бо іншы раз у працэсе выканання індывідуальных заданняў па вучэбнай фальклорнай практыцы ўзнікаюць сітуацыі, якія патрабуюць уменняў самавызначацца ў нестандартных абставінах. Таму так важна, каб, акрамя тэарэтычнай вучэбнай падрыхтоўкі ў групах, выкладчык з мэтай павышэння эфектыўнасці палявых даследаванняў праводзіў індывідуальную работу са студэнтамі.

Выкладчыкамі кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі для збору, фіксацыі і даследавання фальклорнай спадчыны распрацавана праграма фальклорнай практыкі і выдадзены практычныя дапаможнікі: «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Каляндарная абраднасць"», «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Прыкметы і павер'і сямейнай абраднасці"», «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Народная міфалогія беларусаў"», «Фальклорная практыка: практычны дапаможнік па раздзелу "Каляндарныя прыкметы і павер'і"», «Фалькларыстыка: прыкметы і павер'і», «Фалькларыстыка: сямейна-абрадавая паэзія», «Фалькларыстыка. Замовы» і інш.

Па выніках фальклорнай практыкі праводзіцца канферэнцыя, падчас якой дэманструюцца творчыя камп'ютарныя прэзентацыі, падрыхтаваныя на аснове сабраных аўтэнтычных матэрыялаў. Гэта спрыяе арганізацыі дзейнасці студэнтаў па выкарыстанні камп'ютарнай тэхнікі, уплывае на творчы падыход да навучання. На канферэнцыі прысутнічаюць не толькі студэнты – удзельнікі экспедыцыі, але і першакурснікі, для якіх надзвычай карысны такі вопыт.

Бясспрэчнымі станоўчымі якасцямі названага віду дзейнасці з'яўляюцца наступныя:

- захаванне прынцыпу свабоднага выбару (студэнты самі выбіраюць, у складзе якой групы будуць працаваць, а таксама вызначаюць шляхі, крыніцы і форму прадстаўлення матэрыялу);
- арыентацыя на індывідуалізацыю вучэбнага працэсу;
- пошук дадатковай інфармацыі;
- павышэнне якасці засваення вучэбнага матэрыялу і цікавасці да вывучэння традыцыйнай духоўнай спадчыны беларусаў.

Пры кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі паспяхова працуе навукова-вучэбная фальклорная лабараторыя, асноўныя кірункі дзейнасці якой звязаны з суцэльным фальклорна-этнаграфічным абследаваннем тэрыторыі Гомельшчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі, зборам фальклорна-энаграфічных матэрыялаў падчас палявых экспедыцый, удзелам студэнтаў у навуковых канферэнцыях па выніках гэтых экспедыцый, публікацыяй дакладаў у зборніках артыкулаў і матэрыялаў. Трэба адзначыць, што гэта і ёсць шлях у навуку для тых маладых людзей, якія выбіраюць аб'ектам вывучэння праблемы фалькларыстыкі.

У 2012 г. у межах дзейнасці навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі выконваўся навуковы праект «Фальклорна-этнаграфічная спадчына Лельчыцкага раёна: агульнанацыянальнае і рэгіянальна-лакальнае» на сродкі, атрыманыя па гранту Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь для студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў, у выніку якога былі сабраны багатыя мясцовыя звесткі па абрадах і звычаях Лельчыцкага раёна. У 2015 г. маладыя супрацоўнікі навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі таксама атрымалі грант на выкананне навуковай тэмы «Пазаабрадавы фальклор Гомельшчыны: спецыфіка вобразна-мастацкай сістэмы баладных песень, прыказак і прымавак». Плённая праца ў лабараторыі дазволіла выпускнікам філалагічнага факультэта П. М. Цалка (2013 г.) і Г. П. Саўчанка (2014 г.) стаць лаўрэатамі Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па выніках навуковых даследаванняў «Фальклорна-этнаграфічная спадчына Лельчыцкага раёна: рэгіянальна-лакальныя асаблівасці» і «Народныя балады Гомельшчыны: сюжэтна-тэматычная разнастайнасць». Падкрэслім, што работа навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі праводзіцца ў межах аднаго з прыярытэтных кірункаў навуковай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь па стварэнні інвентара элементаў народнай культурнай спадчыны і маніторынгу іх жыццястойкасці.

Даследаванне фальклорна-этнаграфічнай спадчыны – гэта не толькі навуковая дзейнасць і выпрацоўка вучэбных уменняў і навыкаў, але і фарміраванне высокіх грамадзянскіх пачуццяў, выхаванне любові да роднага краю і яго традыцый, павагі да свайго народа.